Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
_____________Ю. П. Бондар
«____»___________ 2016 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___ /вуч.

# МАСТАЦТВА XX ст.
# Раздзел 2. ЭКРАННАЯ КУЛЬТУРА

*Вучэбная праграма для ўстаноў вышэйшай адукацыі
для спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства
(па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05
Мастацтвазнаўства (інтэграванае)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2016

**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. М. Шаройка,* дацэнт кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Я. У. Голікава-Пошка,* старшы навуковы супрацоўнік аддзела экранных мастацтваў дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат мастацтвазнаўства;

*Ю. Д. Персідская,* загадчык кафедры рэжысуры эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», старшы выкладчык, кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 14 ад 20.05.2015);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 18.06.2015)

Адказны за рэдакцыю: *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск: *А. М. Шаройка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Мастацтва ХХ ст.» складаецца з трох раздзелаў: «Традыцыйныя мастацтвы», «Экранная культура», «Дызайн». Дадзеная вучэбная праграма прызначана для вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Мастацтва ХХ ст. Раздзел 2. Экранная культура». Яе выкладанне базіруецца на ведах, атрыманых студэнтамі пры вывучэнні такіх вучэбных дысцыплін, як «Гісторыя мастацтваў», «Мастацтва ХХ ст. Раздзел 1. Традыцыйныя мастацтвы». Веды, атрыманыя пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Экранная культура» з’яўляюцца асновай для далейшага вывучэння студэнтамі-мастацтвазнаўцамі такіх вучэбных дысцыплін, як «Кампаратывістыка ў мастацтве», «Сучасныя тэхналогіі ў мастацтве», «Гісторыя мастацкай крытыкі і мастацтвазнаўства». Яны таксама неабходны для таго, каб глыбей і грунтоўней засвоіць матэрыял тэарэтычных («Анімацыйнае кіно») і практычных («Аўдыявізуальнае рэпрадуцыраванне артэфактаў», «Аналіз твораў мастацтва») вучэбных дысцыплін.

Прадуктыўнае засваенне матэрыялу па вучэбнай дысцыпліне «Мастацтва ХХ ст. Раздзел 2. Экранная культура» забяспечваецца аперыраваннем базавымі ведамі дысцыплін агульнагуманітарнага цыкла, такіх як «Філасофія», «Культуралогія», «Этыка», «Эстэтыка», «Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы».

Змест праграмы пабудаваны па храналагічным прынцыпе і ахоплівае гісторыю кінамастацтва, тэлебачання на працягу ХХ – пачатку ХХІ ст. Асаблівасцю дадзенай вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца аб’яднанне ў праграме тэм, прысвечаных экраннай культуры пэўных перыядаў розных краін свету (сярод іх Беларусь, Расія, ЗША, Францыя, Кітай, Ганконг), што дазваляе студэнту атрымаць уяўленне аб развіцці дадзенага феномена як суцэльнага мастацкага працэсу.

Засваенне адукацыйнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Мастацтва ХХ ст. Раздзел 2. Экранная культура» павінна забяспечыць фарміраванне наступнай *акадэмічнай кампетэнцыі:*

АК-19. Арыентавацца ў спецыфічных актуальных працэсах, якія адбываюцца ў сучасным мастацтве.

Таксама студэнт павінен набыць наступныя *сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі*:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

САК-1. Усведамляць грамадзянскі абавязак, валодаць развітым пачуццём патрыятызму, ведаць правы і прытрымліваццa абавязкаў грамадзяніна.

САК-10. Адаптавацца да новых сітуацый сацыяльна-прафесійнай дзейнасці, рэалізоўваць назапашаны вопыт, свае магчымасці.

Пасля вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен валодаць наступнымі *прафесійнымі кампетэнцыямі* і быць здольным:

ПК-3. Рэалізоўваць агульнадзяржаўныя, рэгіянальныя і ведамасныя праграмы і праекты ў галіне культуры і мастацтваў.

ПК-11. Аналізаваць сучасны стан і перспектывы развіцця мастацтва.

ПК-12. Прымаць удзел у правядзенні экспертызы твораў мастацтва, даваць кваліфікаваныя заключэнні і кансультацыі.

ПК-21. Працаваць з літаратурнымі, дакументальнымі, іканаграфічнымі, архіўнымі матэрыяламі ў сферы сваёй прафесійнай дзейнасці.

ПК-24. Ажыццяўляць арганізацыю рэдакцыйна-выдавецкага працэсу ў галіне мастацтва.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне ў студэнтаў гісторыка-тэарэтычнага ўяўлення пра экранную культуру, яе эвалюцыю і ролю ў жыцці грамадства.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– атрыманне студэнтамі сістэматызаваных ведаў па гісторыі і тэорыі экраннай культуры сродкамі вывучэння мастацкіх кірункаў, рэжысёрскіх стыляў;

– фарміраванне ўяўлення аб мастацкіх праблемах экраннай культуры ў кантэксце з аналагічнымі працэсамі ў свеце.

На падставе атрыманых ведаў студэнт павінен *ведаць*:

– стылістычныя асаблівасці і кірункі экраннай культуры XX ст.;

– інавацыйныя жанравыя, відавыя і стылявыя ўтварэнні ў экраннай культуры XX ст.;

– асноўныя артэфакты, падзеі, імёны буйных прадстаўнікоў экраннай культуры XX ст.;

*умець:*

– вызначаць асаблівасці развіцця кінамастацтва і тэлебачання;

– выкарыстоўваць метад кампаратыўнага аналізу сінтэтычных форм экраннай культуры XX ст.;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выкарыстоўваць набытыя веды ў даследчай практыцы;

*валодаць:*

– катэгарыяльным апаратам і спецыфічнай мовай відаў мастацтва XX ст.;

– метадамі аналізу мастацкага твора XX ст.;

– спосабамі рэпрэзентацыі твораў сучаснага мастацтва ў вербальнай і візуальнай формах.

Асноўнай формай навучання з’яўляюцца лекцыйныя заняткі для атрымання базавай інфармацыі. Тэарэтычныя веды падмацоўваюцца на практычных занятках па прадмеце «Аналіз помнікаў мастацтва».

У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія дапамагаюць прыцягненню студэнтаў у пошук і кіраванне ведамі, набыццю вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, трэба вылучыць:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, прэс-канферэнцыя, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады).

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці педагогам выкарыстоўваецца рэйтынгавая сістэма ацэнкі вучэбнай і даследчыцкай дзейнасці студэнтаў. У мэтах фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускніка УВА ў практыку правядзення семінарскіх і практычных заняткаў укаранёны методыка актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Адукацыйным стандартам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Мастацтва XX ст.» прадугледжана 1136 гадзін. У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Мастацтва XX ст. Раздзел 2. Экранная культура» ўсяго прадугледжана 368 гадзін, з якіх 198 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 114 гадзін, семінарскія – 84 гадзіны. Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў – залікі, экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семінар. |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | - |
| **Раздзел I. Экранная культура краін Заходняй Еўропы, СССР і ЗША (1918–1945)** | | | |
| *Тэма 1.* Экранная культура краін Заходняй Еўропы: агульнае і асаблівае | 2 | 2 | - |
| *Тэма 2.* Экранная культура Германіі | 4 | 4 | - |
| *Тэма 3.* Экранная культура Францыі | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 4.* Экранная культура Італіі | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 5.* Экранная культура СССР | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 6.* Экранная культура ЗША | 4 | 2 | 2 |
| **Раздзел II. Экранная культура краін Заходняй Еўропы і ЗША (1945–2000)** | | | |
| *Тэма 7.* Экранная культура Францыі | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 8.* Экранная культура Італіі | 8 | 4 | 4 |
| *Тэма 9.* Экранная культура Швецыі | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 10.* Экранная культура ФРГ | 8 | 4 | 4 |
| *Тэма 11.* Экранная культура Вялікабрытаніі | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 12.* Экранная культура Іспаніі | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 13.* Экранная культура ЗША | 10 | 4 | 6 |
| **Раздзел III. Экранная культура краін Усходняй Еўропы (1945–2000)** | | | |
| *Тэма 14.* Экранная культура СССР | 8 | 4 | 4 |
| *Тэма 15.* Экранная культура Беларусі | 8 | 4 | 4 |
| *Тэма 16.* Экранная культура Польшчы | 8 | 4 | 4 |
| *Тэма 17.* Экранная культура Венгрыі | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 18.* Экранная культура Чэхіі | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 19.* Экранная культура краін Балкан | 6 | 4 | 2 |
| **Раздзел IV. Экранная культура краін Паўднёва-Усходняй Азіі (1945–2000)** | | | |
| *Тэма 20.* Экранная культура Японіі | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 21.* Экранная культура КНР | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 22.* Экранная культура Ганконга | 6 | 4 | 2 |
| **Раздзел V. Тэорыя тэлебачання** | | | |
| *Тэма 23.* Тэлебачанне ў сістэме экраннай | 6 | 4 | 2 |
| культуры | 4 | 4 | - |
| *Тэма 24.* Жанравая сістэма тэлебачання | 6 | 2 | 4 |
| *Тэма 25.* Тэлевізійная праграма | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 26.* Тэлефільм | 6 | 2 | 4 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Раздзел VI. Тэлебачанне ў грамадска-палітычным і сацыякультурным кантэксце** | | | |
| *Тэма 27.* Тэхнічныя перадумовы з’яўлення тэлебачання | 2 | 2 | - |
| *Тэма 28.* Эксперыментальнае вяшчанне 1930–1940-х гг. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 29.* Фарміраванне тэлебачання як сродку масавай інфармацыі (1950–1960-я гг.) | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 30.* Савецкае тэлебачанне 1970-х–1985 гг. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 31.* Тэлебачанне перабудовы і галоснасці (1985–1991 гг.) | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 32.* Сучасныя праблемы тэлебачання | 4 | 2 | 2 |
| **Раздзел VII. Тэлебачанне і грамадства** | | | |
| *Тэма 33.* Тэлебачанне як працэс камунікацыі | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 34.* Грамадскія функцыі тэлебачання | 2 | 2 | - |
| *Тэма 35.* Тэлебачанне за мяжой | 10 | 6 | 4 |
| *Тэма 36.* Перспектыўныя кірункі развіцця тэлебачання | 4 | 2 | 2 |
| **Разам…** | **198** | **114** | **84** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Экранная культура як люстэрка XX ст. Паняцці «экранная культура», «экраннае мастацтва». Мэты, задачы вучэбнай дысцыпліны. Сувязь з іншымі дысцыплінамі агульнанавуковага і прафесійнага цыклаў.

Асноўныя этапы развіцця экраннай культуры, прынцыпы перыядызацыі. Іх кароткая характарыстыка. Станаўленне тэорыі экраннай культуры. Экран і глядач.

## Раздзел І. Экранная культура краін Заходняй Еўропы, СССР і ЗША (1918–1945)

### *Тэма 1. Экранная культура краін Заходняй Еўропы: агульнае і асаблівае*

Першая сусветная вайна і крызіс цывілізацыі. «Страчанае пакаленне» і дэвальвацыя сацыяльных, маральных, эстэтычных ідэалаў. Дэкаданс, мадэрнізм. Антыбуржуазны пафас мастацкіх пошукаў 1920-х гг. Дэмантаж традыцыйных форм і структур рэалістычнага мастацтва ў спробе актывізацыі грамадскай свядомасці. Экспрэсіянізм, сюррэалізм, кубізм, дадаізм і іншыя кірункі еўрапейскага мастацтва 1920-х гг.

Адкрыццё гуказапісу (1928) і новыя эстэтычныя задачы. Праблема ўраўнаважання выяўлення і гуку, рытму візуальнага і гукавога вобраза. Мастацкая сіла слова як пагроза кіно. Пункты гледжання на перспектыву фільма – тэорыя гукавога дадатку, гукавога прымату, гуказрокавага кантрапункта. Уздзеянне гукавога вобраза на драматургію, мантаж, акцёрскае майстэрства, тэмпарытмічную структуру фільма. Спрашчэнне формы кінатвора, зніжэнне экспрэсіі выяўлення. Трансфармацыя мадэлі кінаапавядання (ад ліра-эпічнай да эпіка-драматычнай). Персаніфікацыя героя.

### *Тэма 2. Экранная культура Германіі*

Паражэнне Германіі ў Першай сусветнай вайне, умовы Версальскага дагавора. Пралетарская рэвалюцыя (студзень 1919 г.), яе падаўленне. Мастацтва Веймарскай рэспублікі і яго сувязь з расстаноўкай палітычных сіл. Камерцыйная прадукцыя. Экранізацыя класікі і кінакамедыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Экспрэсіяністычная мадэль свету ў фільмах 1920-х гг. Стылістычныя пошукі Р. Вінэ (Wine, 1881–1938), Ф. В. Мурнаў (Murnau, 1889–1931), П. Лені (Leni, 1885–1929).

Рост нацысцкіх арганізацый у сярэдзіне 1920-х гг. Гібель нямецкага кінамастацтва пасля нацысцкага перавароту (1933). Націск кінапрапаганды ў гады Другой сусветнай вайны. Тып станоўчага і адмоўнага

героя. Фільм «Юны гітлеравец Квэкс» Х. Штайнхофа як тыпавы прыклад афіцыёзнага кінематографа.

Творчасць Ф. Ланга (Lang, 1890–1976) у пачатку 1930-х гг. Адлюстраванне маральнага крызісу ў краіне і адчуванне бяссілля перад «фатальнымі» сіламі зла ў карціне Ф. Ланга «М» (1931), яе высокі мастацкі ўзровень. Асуджэнне нацысцкай дактрыны ў «Завяшчанні доктара Мабузэ». Уцёкі Ф. Ланга з Германіі.

*Тэма 3. Экранная культура Францыі*

Пасляваенны крызіс французскага кінематографа. Творчая дзейнасць Л. Дэлюка (Delluc, 1890–1924) і ўзнікненне кінаімпрэсіянізму. Французскі кінаавангард (дадаізм, сюррэалізм). Роля французскага кінаавангарда ў развіцці кінамастацтва.

Поставангардысцкая рэакцыя ў французскім кіно 1930-х гг. Першыя гукавыя фільмы. Вяртанне да сюжэтнасці. Паказ прыгажосці звычайнай будзённай рэчаіснасці – галоўная мастацкая задача новага пакалення рэжысёраў (Ж. Віго, Ж. Дзювіўе, М. Карнэ).

Фільмы Р. Клера (Clair, 1898–1981). Нацыянальны характар яго творчасці. Сцэнарнае і рэжысёрскае майстэрства Р. Клера. Перапляценне лірычнага і камічнага ў фільмах «Пад дахамі Парыжа» (1930), «Мільён» (1931), «14-га ліпеня» (1933). Сатырычныя фільмы «Свабоду нам» (1932), «Апошні мільярдэр» (1934).

Росквіт творчасці Ж. Рэнуара (Renoir, 1894–1979). Рознабаковасць яго адоранасці. Антымілітарысцкая філасофская драма «Вялікая ілюзія» (1937). Глыбокі аналіз чалавечых узаемаадносін. Трагедыя простага чалавека ў буржуазна-арыстакратычным свеце («Чалавек-звер», 1938; «Правілы гульні», 1939).

Захоп Францыі фашысцкай Германіяй. Рух Супраціўлення французскага народа. Кінавытворчасць у акупіраваных зонах Францыі. Асуджэнне кампрамісу са злом і перамога чалавечага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

духу ў фільме М. Карнэ (Carne, 1909–1994) «Вячэрнія наведвальнікі» (1942), яго стылявыя асаблівасці. Кінараман «Дзеці райка» (1943–1945) – гімн мастацтву, звернутаму да народа і да адвечных каштоўнасцей.

Патрыятычныя тэндэнцыі ў фільмах на сучасную тэму. Сэнс фільма аб салідарнасці і таварыскасці «Мы – хлапчукі» Л. Дакена.

*Тэма 4. Экранная культура Італіі*

Крызіс італьянскага мастацтва пасля фашысцкага перавароту (1922). Заняпад экраннай культуры. Фашызацыя кінематографа. Афіцыёзны кінематограф часоў Б. Мусаліні. Мадэрнізацыя вытворчасці (будаўніцтва «Чынечыта», утварэнне рымскага Эксперыментальнага кінацэнтра). Удзел Італіі ў Другой сусветнай вайне. Антыфашысцкі рух Супраціўлення, яго асаблівасці і праграма дзеянняў.

Ідэйная апазіцыя фашызму сярод дзеячаў кінематографа. Уплыў прагрэсіўнага і савецкага кіно. Творчасць рэжысёраў-неарэалістаў Р. Раселіні (Rossellini), В. дэ Сіка (Vittorio de Sica), Дж. дэ Санціса (de Santis). Цэнзура, прадзюсары і Ватыкан супраць неарэалізму. Спад у творчасці вядучых майстроў.

*Тэма 5. Экранная культура СССР*

Арганізацыйныя мерапрыемствы савецкай улады ў галіне кіно пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Кінааддзел (пазашкольнага аддзела) Наркамасветы – першая дзяржаўная кінаўстанова. Арганізацыя і дзейнасць Маскоўскага і Петраградскага камітэтаў. Увядзенне кантролю і цэнзуры на кінапрадпрыемствах па заказе кінакамітэтаў.

Эксперыментальная майстэрня Л. Куляшова (1899–1970). Тэорыя кінамантажу. «Эфект Куляшова». Тэорыя кінанатуршчыка. Фільмы Л. Куляшова.

С. Эйзенштэйн (1898–1948). Пачатак творчага шляху. Тэатральныя працы. Артыкул «Мантаж атракцыёнаў». Фільмы дэкалога «Да дыктатуры». Зварот да сучаснай тэмы ў кінастужцы «Старое і новае» («Генеральная лінія», 1929). Тэарэтычныя працы С. Эйзенштэйна 1920-х гг. Тэорыя «мантажу атракцыёнаў», «інтэлектуальнага кіно», «тыпажу», «абертоннага мантажу».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У. Пудоўкін (1893–1953). Праца ў якасці акцёра, мастака, асістэнта рэжысёра. Драматычны эпас фільмаў «Маці» (1926), «Канец Санкт-Пецярбурга» (1927), «Нашчадак Чынгісхана» («Бура над Азіяй», 1928). Тэорыя і практыка «эмацыянальнага сцэнарыя». Пошукі новых выразных сродкаў экрана («цайт-лупа»).

Першы Усесаюзны з’езд савецкіх пісьменнікаў (1934). Афіцыйнае абвяшчэнне на з’ездзе адзінага творчага метаду савецкай літаратуры і мастацтва – сацыялістычны рэалізм. Нарматыўнасць і палітызаванасць прынцыпаў сацрэалізму, іх уплыў на далейшае развіццё савецкага кінамастацтва.

Кінематограф другой паловы 1930-х гг. I Міжнародны кінафестываль у Маскве (1935). Першая Усесаюзная нарада творчых работнікаў кіно (1936). Новае разуменне ролі мантажу, арыентацыя на драматургію характараў і развіццё апавядальна-драматычных жанраў.

Актывізацыя кантактаў кінематографа з літаратурай, тэатрам, музыкай, жывапісам. Зацвярджэнне кінадраматургіі як ідэйна-мастацкай асновы фільма. Масавы глядацкі поспех многіх фільмаў і прапаганда ідэалагічных міфаў сталінскага рэжыму з дапамогай кіно. Узмацненне таталітарнай улады арыгінальных па змесце і форме твораў. Забарона фільмаў «Бежын луг» С. Эйзенштэйна, «Закон жыцця» А. Столпера і Б. Іванова і інш.

*Тэма 6. Экранная культура ЗША*

Эпоха «прасперыці», яе супярэчлівасці. Эстэтычныя стандарты мастацтва ЗША 1920-х гг. Месца Галівуда ў сцвярджэнні ідэалаў «амерыканскай мроі».

Аслабленне еўрапейскага кінематографа ў ходзе канкурэнтнай барацьбы з Галівудам. Пераезд у ЗША вядучых рэжысёраў Швецыі, Германіі, Францыі і іншых краін. Асноўныя жанры (салонная камедыя-драма, кінакамедыя) камерцыйнай прадукцыі, яе стандартнасць, прапагандысцкая агрэсіўнасць.

Галівуд на парозе «гукавога» кінематографа. Пераабсталяванне кінапрамысловасці ў сувязі з пераходам да выпуску гукавых фільмаў (1928). Асаблівасці першых гукавых фільмаў. Кодэкс Хейса. Масавая кінапрадукцыя. Далейшая стандартызацыя кінажанраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нападзенне Японіі на Пёрл-Харбар і ўступленне ЗША ў вайну. Зацвярджэнне Дзяржаўным Кіраўніцтвам ваеннай інфармацыі правіл ваеннай прапаганды для прадзюсараў Галівуда.

Аддзелы арміі, авіяцыі і флоту, іх роля ў арганізацыі антыфашысцкай прапаганды. Амерыканскія мастацка-дакументальныя фільмы аб мужнасці ўдзельнікаў вайны («Востраў Уэйк», «Дзённік Гвадалканала», «Дзеянні ў Паўночнай Атлантыцы»). Фільмы пра Расію і барацьбу савецкага народа з фашызмам («Песня пра Расію», «Місія ў Маскву»), наіўнасць увасаблення, фактычныя недакладнасці.

Змяненне палітычнай арыентацыі ЗША пасля 1943 г. (бітва пад Сталінградам), узмацненне «правых» у Галівудзе. Захапленне містыкай («Песня аб Бернадзеце», Г. Кінг) і псіхапаталогіяй («Газавы свет», «Жанчына ў вакне»).

## Раздзел II. Экранная культура краін Заходняй Еўропы і ЗША (1945–2000)

### *Тэма 7. Экранная культура Францыі*

Францыя паміж заканчэннем Другой сусветнай вайны і абвяшчэннем Чацвёртай рэспублікі (1945–1947). Экранная культура Чацвёртай рэспублікі (1948–1958). Халодная вайна і абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей. «Група 30-ці», яе мэты і задачы. Разнастайнасць жанраў, фільмаў і творчых індывідуальнасцей мастакоў.

Пятая рэспубліка пры Ш. дэ Голю (1958–1969). Курс на знешнепалітычную незалежнасць і стабілізацыю эканомікі, «дэпалітызацыя» інтэлігенцыі. Група «Кае дэ сінема» (А. Базэн (Bazin, 1918–1958), Ф. Труфо (Truffaut, 1932–1984), К. Шаброль (Chabrol, 1930–2010), Л. Маль (Malle, 1932–1995), Ж. Л. Гадар (Godard, 1930) і інш.), яе роля ў падрыхтоўцы «новай хвалі» (1958–1968). Другое пакаленне «новай хвалі» (Ж. Дэмі (Demy, 1931–1990), А. Варда (Varda, р. 1928), К. Лелуш (Lelouch, р. 1937), урастанне ў камерцыйны кінематограф.

Асноўныя тэндэнцыі французскай экраннай культуры 1970–1980-х гг. Адказ ад сацыяльнай праблематыкі, акцэнт на густы абывацеля. Найбольш папулярныя жанры кіно: «паліцэйскі фільм», кінакамедыя, парнафільм. Новыя кіназоркі: А. Жырардо (Girardot, р. 1931), Л. Вентура (Ventura, 1918–1987),

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ж. Л. Трэнціньян (Trintignant, р. 1930), Ж. Дзепардзье (Depardieu, р. 1948).

Спад 1980-х гг. Перавага камерцыйных фільмаў, узмацненне (больш 50% у пракаце) пазіцый Галівуда, падзенне інтарэсу да айчынных кінастужак. Фільмы маладых рэжысёраў Л. Каракса (Carax, р. 1960), Л. Бесона (Besson, р. 1959), Ж. Ж. Ано (Annaud, р. 1943), Р. Варнье (Wargnier, р. 1948), Ф. Азона (Ozon, р. 1967).

### *Тэма 8. Экранная культура Італіі*

Палітычныя праблемы 1960-х гг. у італьянскіх фільмах, усёмагутнасць мафіі, карупцыя ўлады. Расчараванне інтэлігенцыі ў грамадстве «спажывання», песімізм, адчуванне тупіка.

Левaрадыкальныя тэндэнцыі ў экраннай культуры 1970-х гг. Узаемасувязі авангарда і масы, фанатызм і прагматызм у фільмах «кантэстацыі» Б. Берталучы (Bertolucci) «Перад рэвалюцыяй» (1964), М. Белокія (Bellocchio) «Кулакі ў кішэні» (1965), братоў П. і В. Тавіяні (Taviani) «Пад знакам Скарпіёна» (1969).

«Палітычны» фільм – вядучы кірунак у кінематографе 1970-х гг. Жанравая і стылістычная разнастайнасць «палітычных» фільмаў, тэндэнцыя да зліцця жанраў. Фашызм як паталогія грамадства і асобы ў фільмах Б. Берталучы («Канфарміст»).

Масавая прадукцыя 1970 – пачатку 1980-х гг.: адыход ад актуальнасці тэматыкі, парнафільмы, пастановачныя баевікі, «спагеці-вестэрны», фільмы жахаў, крымінальныя драмы, камедыі палажэнняў і фарсы. Экспансія Галівуда.

Уздым італьянскай экраннай культуры ў канцы 1980-х гг. Фінансавая падтрымка з боку тэлебачання, арганізацыя фестываляў для дэбютантаў, з'яўленне новых кінашкол. Лідары «новай» італьянскай экраннай культуры: Дж. Берталучы (Bertolucci, р. 1947), Дж. Амеліа (Amelio, р. 1945), Н. Марэці (Moretti, р. 1953), Д. Арджэнта (Argento, р. 1940).

### *Тэма 9. Экранная культура Швецыі*

Пачатак Другой сусветнай вайны і шведскі нейтралітэт. Моладзь і яе незадаволенасць філасофіяй абывацельскага эгаізму. Прызыў да абуджэння ў фільмах 1940–1945-х гг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фільм «Цкаванне» (1943) А. Шэберга (Sjoberg, 1903–1980) як маніфест «фюртыёталізму».

Швецыя пасля вайны. Эканамічныя цяжкасці шведскай экраннай культуры (вузкасць кінарынку, высокі налог на кінатэатры, канкурэнцыя Галівуда). Камерцыйная прадукцыя: дэтэктывы, фільмы жахаў, меладрамы, фарсы.

Шведская экранная культура 1960–1970-х гг. Стварэнне Шведскага кінаінстытута (1962), яго роля ў развіцці нацыянальнага кінамастацтва. Павелічэнне выпуску фільмаў, аднаўленне рэжысёрскіх кадраў. Пераход Шведскага кінаінстытута ў канцы 1970-х гг. у рукі камерсантаў. Скарачэнне кінавытворчасці. Аднаўленне былой ролі Шведскага кінаінстытута пры І. Данырэі. Барацьба за выжыванне шведскай экраннай культуры ва ўмовах перавагі галівудскай прадукцыі.

Барацьба за дзяржаўную падтрымку кінематаграфіі, арыентацыя на якасную шведскую экранную культуру з канца 1980-х гг. Сумесныя пастаноўкі са скандынаўскімі краінамі. Шведскія кінакамедыі. Традыцыі «шведскай школы» ў творчасці Б. Аўгуста і Ч. Сундваля. Л. Мудзісан (Mudisson, р. 1969) – вядучы рэжысёр новага пакалення шведскага кіно. Моладзь супраць грамадскай крывадушнасці і жорскасці, праблемы юных у свеце рацыяналізму, новых тэхналогій і цынізму.

*Тэма 10. Экранная культура ФРГ*

Утварэнне ФРГ (1949). Захват заходнегерманскага кінарынку Галівудам. Спробы рэабілітацыі «сярэдняга немца» і яго кампрамісу з нацызмам у першых фільмах ФРГ. Кінематограф «эканамічнага цуду», пропаведзь эскапізму і афіцыйнага аптымізму. Х. Койтнер (Kautner, 1908–1980) – вядучы рэжысёр 1950-х гг. Крызіс экраннай культуры ФРГ у канцы 1950-х гг., яго прычыны.

Экранная культура ў 1960-я гг. Узнікненне групы «новае нямецкае кіно», Аберзаўзенскі маніфест (1962). А. Клюге (Kluge, р. 1932) і яго роля ў фарміраванні «новага нямецкага кіно». Адмова ад «рэпрадукцыі» рэчаіснасці.

Экранная культура ў 1970–1980-я гг. Антыфашысцкая тэматыка. Філасофскія, сацыяльныя, маральна-этычныя праблемы. Пошукі новых выразных сродкаў. Творчасць буйнейшых рэжысёраў Ф. Шлёндарфа (Schlondorff, р. 1939), В. Вэндарса (Wenders, р. 1945), Р. В. Фасбіндэра (Fassbinder, 1946–1982), В. Херцага (Herzog, р. 1942). Акцёры «новага нямецкага кіно»:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Б. Зукава (Sukowa, р. 1950), К. Кінскі (Kinski, 1926–1991), Х. Шыгула (Schygulla, р. 1943) і інш.

Экранная культура ФРГ 1980-х гг. Пачатак застою і перспектывы развіцця. Сітуацыя ў краіне пасля аб’яднання. Т. Тыквер (Tykwer, р. 1965) і «пакаленне Х».

*Тэма 11. Экранная культура Вялікабрытаніі*

Уплыў Галівуда пасля заканчэння Другой сусветнай вайны. «Незалежныя прадзюсары» і фільмы аб паўсядзённым жыцці радавых англічан. Вяртанне рэалістычных і гуманістычных прынцыпаў у камедыях студыі «Ілінг». «Раз’юшаныя» ў англійскай літаратуры і тэатры, іх уплыў на англійскую экранную культуру і яе ўздым у 1958–1963 гг. Камерцыйнае кіно: асацыяльнасць падыходу, эскапізм, настальгія па былой веліччы і моцнай асобе. Вядучыя жанры: фільм жахаў, кінакамедыя, прыгодніцкі фільм (серыя фільмаў аб Дж.Бондзе, суперкалосы Д. Ліна).

1980-я гг.: перагляд імперскіх міфаў і ідэі еўрапейскага месіянства ў фільмах Д. Атэнбора (Attenborough, р. 1923), Д. Ліна (Lean, 1908–1991), Р. Жофэ (Joffe, р. 1945). Постмадэрнізм і фільмы Д. Джармэна (Jarman, 1942–1994) («Караваджа», 1986; «Усё, што засталося ад Англіі», 1987). П. Грынуэй (Greenaway, р. 1942) – лідар еўрапейскага «авангарда» канца 1980-х гг.

*Тэма 12. Экранная культура Іспаніі*

1950-я гг.: новая сітуацыя ў іспанскай экраннай культуры. Уплыў неарэалізму, інтарэс да сацыяльных праблем і асуджэнне абывацельскага канфармізму. Сатырычныя стужкі Л. Г. Берлангі (Berlanga, 1921–2010) і сацыяльныя праблемы Іспаніі. Бездухоўнасць іспанскага грамадства, яго маральная дэградацыя ў драмах Х. А. Бардэма (Bardem, 1922–2002).

Іспанская экранная культура 1960-х гг.: змяненне структуры кінавытворчасці, з’яўленне «незалежных» прадзюсараў. «Маладое іспанскае кіно» 1960-х гг. Фільмы рэжысёраў мадрыдскай школы.

Узмацненне цэнзурнага прыгнёту ў пачатку 1970-х гг. Рэпрэсіі ў асяроддзі кінематаграфістаў, пераход шэрагу рэжысёраў у камерцыйнае кіно. Адмена цэнзуры (1977). З’яўленне палітычных фільмаў «Сем дзён у студзені» і «Перасцярога»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Х.А. Бардэма – буйны поспех дэмакратычнага іспанскага кіно. Міжнародны поспех фільмаў К. Саўры. Новыя імёны іспанскага кіно канца XX ст. – творчасць П. Альмадовара (Almodovar, р. 1951), Х. Медэма (Medem, р. 1958), Б. Луны (Luna, р. 1946).

### *Тэма 13. Экранная культура ЗША*

ЗША пасля смерці Ф. Рузвельта і заканчэння Другой сусветнай вайны. Дэбюты маладых рэжысёраў: Э. Дмытрыка (Dmytryk, 1908–1999), Э. Казана (Kazan, 1909–2003), Ж. Дасэна (Dassin, 1911–2008) і інш. Галівуд у перыяд працы камісіі па расследаванні антыамерыканскай дзейнасці. Суд над галівудскай «дзясяткай» (1947), праследаванне іншадумцаў, «чорныя спісы», новыя ідэалагічныя акцэнты: антыкаменізм, шпіёнаманія, апалогія ўзброенай сілы ЗША («Ліс пустыні», «Жалезная заслона»). Перамены ў Галівудзе. Рашэнне Вярхоўнага суда (1947) аб аддзяленні вытворчасці фільмаў ад іх пракату. Падзенне даходаў буйнейшых фірм. Канкурэнцыя тэлебачання. Укараненне шырокага экрана (1952). Стэрэафанія, панарамнае і шырокафарматнае кіно. Рэарганізацыя кінавытворчасці (1949–1953), з'яўленне мелкіх прадзюсараў. Рэалістычныя фільмы «незалежных»: «Марці» (Д. Ман), «Дванаццаць раз'юшаных мужчын» (С. Люмет), «Сцежкі славы» (С. Кубрык).

Маніфест групы «Новае амерыканскае кіно» (1960). Барацьба з галівудскімі стандартамі і пошукі новых выразных сродкаў. Здымкі імправізацыйным метадам («Цені» Д. Касавецiса, «Сувязны» Ш. Кларк). Арганізацыя І. Мекасам «Кааператыва кінематаграфістаў» (1962).

Амерыка пасля Д. Кенэдзі. Абвастрэнне сацыяльна-палітычнага клімату (антырасісцкія маршы пратэсту, асуджэнне вайны ў В'етнаме, бунт моладзі) і яго адлюстраванне ў кінамастацтве («Сем дзён у маі», Дж. Франкенхаймер, «Як я навучыўся не баяцца і палюбіў бомбу», С. Кубрык, «Халодны свет», Ш. Кларк, «Раз бульба, два бульба», Л. Пірс).

Галівуд у 1970–1980-я гг. Неакансерватызм, вяртанне да традыцыйных амерыканскіх міфаў. Эмансіпацыя жанчыны і праблемы сям'і – «Крамер супраць Крамера» (Р. Бэнтан). Папулярнасць рэтра: «Папяровы месяц» (П. Багданавіч), «Афера» (Дж. Р. Хіл). Міф аб «Імперыі зла» і стэрэатыпы халоднай вайны («Тэлефон», Д. Сігал; «Рэмба-2» С. Сталонэ). Масавая прадукцыя – трылеры, фільмы-катастрофы,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

містычныя кінастужкі: «Сківіцы» (С. Спілберг), «Зоркавыя войны» (Дж. Лукас).

«Новы Галівуд» – пакаленне кінематаграфістаў, якія атрымалі адукацыю на кінафакультэтах універсітэтаў (Ф. Ф. Копала, Д. Лукас, М. Скарсэзэ, С. Спілберг і інш.). Арыентацыя на аўтарскі фільм і еўрапейскі вопыт.

Фільмы аб адваротным боку палітычнага жыцця ЗША («Уся прэзідэнцкая рацы» А. Пакулы). Антыфашысцкая тэма ў фільме «Джулія» Ф. Цынэмая. Асэнсаванне эпохі макартызму ў фільмах «Падстаўны твар» (М. Рыт), «Якімі мы былі» (С. Полак), «Дэнізл» (С. Люмет). Праблемы моладзі, злачынствы як вынік бездухоўнасці цывілізацыі («Байцовыя рыбкі» Ф. Ф. Копалы). Мафія як бізнес у трылогіі Ф. Ф. Копалы «Хросны бацька». В'етнам буйным планам («Узвод» О. Стоўна, «Апакаліпсіс сёння» Ф. Ф. Копалы). Крах «амерыканскай мроі» ў фільмах М. Скарсэзэ («Аліса тут больш не жыве», «Таксіст», «Шалёны бык», «Кароль камедыі»).

Далейшая манапалізацыя амерыканскай кінавытворчасці. Узмацненне пазіцый Галівуда ў сусветным кінапракаце. Арыентацыя на маладзёжную аўдыторыю і падлеткаў. Фантастычныя пастановачныя баевікі і вядучыя рэжысёры гэтага жанру. Секс і гвалт ў трылерах канца 1980-х. Эвалюцыя фільма жахаў, поспех «Маўчання ягнят». Амерыканскі кінаавангард: Д. Лінч (серыял «Твін Пікс»), Дж. Джармуш («Мярцвяк», 1995).

Галівуд 1990-х гг. Пераўтварэнне буйнейшых кінафірм у кінааддзяленні транснацыянальных карпарацый. Працэс глабалізацыі і інтэрнацыяналізацыі Галівуда: пераход шэрагу кампаній у рукі японскіх карпарацый, касмапалітызацыя тэматыкі. Амерыканскі аўтарскі фільм: творчасць Д. Айвары (Ivory, р. 1928), В. Ален (Allen, р. 1935). Постмадэрнісцкія пошукі Ц. Бёртана (Burton, р. 1958) і фільмы Дж. і Э. Коэнаў (Coen, браты Джоэл (р. 1954) і Этан (р. 1957).

Папулярнасць жанру фэнтэзі, укараненне новых тэхналогій мыслення і ўспрымання (трылогія братоў Л. і Э. Вачоўскіх «Матрыца»). Элементы джынгаізму і прапаганды амерыканскай ролі ў свеце – «Дзень незалежнасці» (1996, Р. Эмерых) і «Армагедон» (1998, М. Бей). Блокбастары канца 1990-х гг. («Тытанік», 1998, Д. Камеран). Сацыяльная праблематыка ў фільме С. Содэрберга «Эрын Брокавіч» (2002). Выцясненне рэалістычных драм на тэлебачанні. Праблемы афраамерыкан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цаў у творчасці С. Лі (Lee, р. 1956). Новыя тэндэнцыі ў творчасці С. Спілберга: «Спіс Шындлера» (1993), «Выратаваць радавога Раяна», «Штучны інтэлект» (2001). Кабельнае, касетнае, касмічнае тэлебачанне і перспектывы развіцця амерыканскай кінавытворчасці.

Эвалюцыя амерыканскага мюзікла: новыя тэндэнцыі ў рэжысуры і драматургіі («Вестсайдская гісторыя» Р. Уайза, «Кабарэ» і «Увесь гэты джаз» Б. Фоса). Новы ўзлёт мюзікла («Чыкага», 2002, Р. Маршал).

## Раздзел III. Экранная культура краін Усходняй Еўропы (1945–2000)

### *Тэма 14. Экранная культура Расіі*

Савецкая экранная культура на рубяжы 1950–1960-х гг.: пераадоленне канонаў афіцыёзнага кінематографа, агульная гуманізацыя экраннай культуры, новая генерацыя маладых кінематаграфістаў. Узмацненне аўтарскага пачатку ў кінамастацтве. Зараджэнне кінааматарскага руху. Грамадская роля кіно, яго ўзаемадзеянне з тэлебачаннем.

Супярэчлівасці кінапрацэсу. Рэанімацыя бюракратычных і суб’ектыўных метадаў кіраўніцтва мастацтвам у сярэдзіне і другой палове 1960-х гг. Нарастанне крызісных з’яў у сацыяльна-эканамічным развіцці краіны ў сферы культуры, літаратуры і мастацтваў.

Супярэчлівасць развіцця экраннай культуры 1970 – першай паловы 1980-х гг. Нізкі мастацкі ўзровень многіх фільмаў. Арыентацыя на закупку і шырокі пракат заходняй кінамакулатуры. Адсутнасць на экранах значных твораў майстроў заходняй экраннай культуры.

Экранная культура другой паловы 1980-х гг. Рэзкая канфрантацыя з папярэдняй гісторыяй савецкай экраннай культуры, яго ідэалогіяй і яго прыярытэтамі. Выпуск на экран «палічных» фільмаў Г. Панфілава («Тэма»), А. Аскольдава («Камісар»), Г. Палокі («Інтэрвенцыя») і інш. Аднаўленне аўтарскіх версій фільмаў, якія падвергліся ідэалагічнай цэнзуры, А. Канчалоўскага («Гісторыя Асі Клячынай…»), М. Хуцыева («Мне дваццаць год» («Застава Ільіча») і інш.

Кінематограф – рупар афіцыйных ідэалагічных установак. Працяг лепшых традыцый расійскага кіно таленавітымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

майстрамі экраннай культуры. «Новы гістарызм» і жывапісна-паэтычная відовішчнасць (з 1970-х гг.).

Вызваленне кінематографа ад партыйна-дзяржаўнага дыктату, але і ад гарантаванага фінансава-вытворчага забеспячэння. Распрацоўка новай эканамічнай мадэлі экраннай культуры. Перагляд эстэтычных канонаў экраннай культуры савецкага перыяду. Засваенне новай рэальнасці, разлік з гістарычным мінулым. Праблема выжывання расійскай экраннай культуры.

*Тэма 15. Экранная культура Беларусі*

Дакументальны фільм «Вызваленне Савецкай Беларусі» (1944) і яго роля ў развіцці тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў кінамастацтве рэспублікі. Рух ад дэкларацыі да даследавання ў першых іграввых стужках аб вайне «Канстанцін Заслонаў» (1949) А. Файнцымера і У. Корш-Сабліна і «Гадзіннік спыніўся апоўначы» (1958) М. Фігуроўскага. Асаблівасці фільмаў для дзяцей Л. Голуба (1904–1994). Кінематограф як папулярызатар лепшых работ нацыянальнага тэатра. Увага да праблем паўсядзённасці («Шчасце трэба берагчы», «Нашы суседзі», «Строгая жанчына»).

Расшырэнне кінавытворчасці. Прыход у 1960-я гг. у кіно новай генерацыі маладых кінематаграфістаў – «дзяцей вайны». Новы погляд на падзеі Вялікай Айчыннай вайны ў фільмах В. Турава (1936–1996), В. Вінаградава (р. 1933), І. Дабралюбава (1933–2010); экранізацыях прозы В. Быкава Р. Віктарава (1929–1983), Б. Сцяпанава (1927–1992), Л. Мартынюка (р. 1932). Пошукі новых жанрава-стылявых вырашэнняў – стварэнне В. Чацверыковым кінаэпапеі «Полымя» (1974), В. Рубінчыкам кінапаэмы «Вянок санетаў» (1977). Іграваая кінапубліцыстыка («Нядзельная ноч», «Узбочына», «Хроніка ночы»).

Творчыя дасягненні 1980–1990-х гг.: экранізацыя В. Туравым рамана І. Мележа «Людзі на балоце», В. Рубінчыкам аповесці У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха», В. Рыбаравым рамана В. Адамчыка «Чужая бацькаўшчына». Новае асэнсаванне тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў фільмах «Ідзі і глядзі» Э. Клімава, «Знак бяды» М. Пташука.

Крызіснае становішча ў экраннай культуры на рубяжы XX–XXI стст. «Кааператыўнае кіно». Зніжэнне творчых крытэрыяў. Новыя аспекты вырашэння тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў фільме М. Пташука «У жніўні 44-га…».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 16. Экранная культура Польшчы*

Адкрыццё ў 1948 г. у Лодзі кінашколы (першы кіраўнік – Е. Цепліц). Стварэнне сеткі кінастудый (Лодзь, Вроцлаў, Варшава, Тушын, Бельска-Бяла). Невялікі аб'ём кінавытворчасці ў першыя пасляваенныя гады, жорсткая цэнзура польскага кіно. А. Форд (Ford, 1908–1980) – лідар пасляваеннага кіно. Высокі мастацкі ўзровень фільмаў «Памежная вуліца» (1949), «Юнацтва Шапэна» (1952), «Крыжаносцы» (1960). Своеасаблівасць фільмаў, створаных А. Фордам у эміграцыі («У крузе першым», 1972; «Вы вольны, доктар Корчак», 1973). Антыфашысцкая тэматыка фільмаў В. Якубоўскай («Апошні этап», 1947; «Канец нашага света», 1964).

Кіно новага пакалення (другая палова 1950 – пачатак 1960-х гг.): А. Вайды, Е. Каваляровіча, А. Мунка. А. Мунк (Munk, 1921–1961) – інтэлектуальны лідар «польскай школы». Спалучэнне палітычнай актуальнасці, нонканфармізму і польскай іроніі ў фільмах «Чалавек на рэйках» (1956), «Героіка» (1957), «Касавокае шчасце» (1959).

Актуальнасць сацыяльна-палітычнай праблематыкі («Самсон», 1961; «Без наркозу», 1978; «Каханне ў Германіі», 1983 і інш.) у фільмах А. Вайды (Wajda, р. 1926). Экранізацыя рэжысёрам твораў літаратурнай класікі («Попел», 1965; «Пілат і іншыя», 1971; «Настасся», 1994 і інш.).

Элементы сацрэалізму ў спалучэнні з новай дакладнасцю ў фільмах Е. Каваляровіча (Kawalerowicz, р. 1922) «Цэлюлоза» (1954), «Цягнік» (1959). Гістарычны фільм рэжысёра «Фараон» (1965).

Крызіс «польскай школы» ў 1960-я гг. Новая праблематыка і новая эстэтыка ў філасофскіх фільмах В. Хаса (Has, 1925–2000) («Рукапіс, знойдзены ў Сарагосе», 1964; «Санаторый пад Кляпсідрай», 1973).

Экранізацыя Е. Гофманам (Hoffman, р. 1932) раманаў Г. Сенкевіча («Пан Валадыёўскі», 1968; «Патоп», 1974; «Агнём і мячом», 1999) і яго меладрам («Знахар», 1981; «Прыгожая незнаёмка», 1992).

Жорсткая палітычная цэнзура і вымушаная эміграцыя ў 1960-я гг. рэжысёраў Р. Палянскага (Polanski, р. 1933), Е. Скалімоўскага (Skolimowski, р. 1938). Інтэграцыя кіно і тэлеба-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чання з канца 1970-х гг. Творчасць К. Занусі (Zanussi, р. 1939) і К. Кесьлёўскага (Kieślowski, 1941–1996).

*Тэма 17. Экранная культура Венгрыі*

Росквіт венгерскага кінамастацтва ў 1950-я гг. Галоўная тэма – крызіс (палітычны, сацыяльны, духоўны, інтэлектуальны) грамадства і асобы. Чалавек і гісторыя як трагічны канфлікт. Прыхільнасць венгерскіх кінематаграфістаў да нацыянальнай гісторыі і культуры. Творчасць З. Фабры (Fábri, 1917–1994), М. Янча (Jancsó, 1921–2014), І. Саба (Szabó, р. 1938).

Сумесная вытворчасць з краінамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы як спосаб пераадолення фінансава-вытворчага крызісу на рубяжы XX–XXI стст. Сучасныя рэжысёры венгерскага кіно: І. Энэдзі (Enyedi, р. 1955), Д. Палфі (Pálfi, р. 1974).

*Тэма 18. Экранная культура Чэхіі*

Вяртанне ў пасляваенную Чэхаславакію з-за мяжы рэжысёраў І. Вайса, О. Вавры (Vavra, р. 1911), Э. Клоса, Я. Кадара, М. Фрыча. Крытыка сучаснасці, кафкіянскія матывы, правакацыйнасць формы, ідэйныя навацыі ў фільмах чэшскай «новай хвалі». Творчасць вядучых рэжысёраў-чэхаў М. Формана (Forman, р. 1932), І. Менцыля (Menzel, р. 1938), В. Хіцілавай (Chytilova, 1929–2014), славакаў Ю. Якубіска (Jakubisko, р. 1938), Ш. Угера (Uger, 1930–1993).

Пераемнасць традыцый чэхаславацкай экраннай культуры ў перыяд сепаратнага існавання чэшскай і славацкай кінематаграфіі. Новае пакаленне рэжысёраў: чэхаў Я. Сверака (Svěrák, р. 1965), Я. Шванкмаера (Švankmajer, р. 1934), славака М. Шуліка (Sulík, р. 1962).

*Тэма 19. Экранная культура Балкан*

Стварэнне ў 1945 г. у шасці рэспубліках кінастудый. «Засваенне» эстэтыкі сацрэалізму. Ваенная тэматыка на экране. «Даліна міра» Ф. Шцігліц (1956). Творчасць В. Булаіча (Bulajic, р. 1928) (фільмы «Замах у Сараева», 1975; «Высокае напружанне», 1981 і інш.).

Ліберальнасць цэнзуры, песімізм. Вытокі «чорнай хвалі» ў творчасці рэжысёраў 1950-х гг.: У. Пагачыча (Pogačić, 1919–1999), Ф. Шцігліца (Štiglic, 1919–1993). Жорсткі натуралізм, інтарэс да жыцця маргеналаў, страта надзеі і «ідэалаў камунізму і рэвалюцыі» ў югаслаўскім «чорным фільме» 1960–

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1970-х гг. Творчасць вядучых прадстаўнікоў А. Петравіча (Petrovic, 1929–1994) («Тры», «Хутка будзе канец свету»), Д. Макавеева (Makaveje, р. 1932) («Чалавек не птушка», «ВР – Тайны арганізма»).

Змрочны рэалізм фільмаў канца 1980-х гг. на фоне сацыяльных катаклізмаў («Жыццё цудоўна» Б. Драшкавіча). Апошні югаслаўскі фільм – трагікамедыя «Ціта і я» (1992) Г. Маркавіча.

## Раздзел IV. Экранная культура краін Паўднёва-Усходняй Азіі (1945–2000)

### *Тэма 20. Экранная культура Японіі*

Японская экранная культура першых пасляваенных гадоў. Дэмакратычныя фільмы «незалежных» («Жанчына ідзе па зямлі» Ф. Камеі). Нацыянальныя асаблівасці і ўплыў заходняй культуры на творчасць А. Курасавы. Стварэнне незалежных кінастудый у адказ на камерцыялізацыю вытворчасці, дыктат вядучых фірм і ўзрастаючы экспарт галівудскіх стужак.

Крызіс японскай экраннай культуры на рубяжы 1970-х гг.: разарэнне большасці фірм, зніжэнне мастацкага ўзроўню, адыход шэрагу «незалежных». «Новы левы рух» і фільмы маладых кінематаграфістаў супраць мілітарызму, за ліквідацыю амерыканскіх вайсковых баз, аб праблемах моладзі і амаральным клімаце ў свеце мастацтва («Трагедыя», Ш. Саваі).

Экранная культура 1990-х гг. Камерцыйная прадукцыя і галівудскія мадэлі. Трансфармацыя традыцыйных жанраў. Уплыў японскіх коміксаў. Самурайскія фільмы і папулярнасць «якудза» – стужак аб мафіі. Фільмы жахаў як характэрная тэндэнцыя сучаснай японскай экраннай культуры (Х. Наката – «Званок», 1998; Т. Хімідзу – «Праклятыя», 2003; Т. Мііке – «Кінапроба»). Змяшэнне жанраў (жахі і камедыйны мюзікл) у «Шчасце сям'і Катакуры» Т. Мііке (2001). Рост папулярнасці музычных фільмаў («Давайце патанцуем?», М. Суо) і анімацыі («Знесеныя прывідамі», Х. Міядзакі, 2001). Асаблівасці японскай акцёрскай школы: І. Ямала, Т. Кітана і інш.

### *Тэма 21. Экранная культура КНР*

Асуджэнне і паступовае пераадоленне вынікаў «культурнай рэвалюцыі» ў кінематографе 1980-х гг. Экранізацыя твораў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

класікі кітайскай літаратуры Лу Сіня (трагікамічны гратэск «Сапраўдная гісторыя А-Ку», Цэнь Фан, 1981). Культ моцы ў серыі кун-фу (пачатак 1980-х гг.). «Новае кіно» выпускнікоў Пекінскага інстытута кінематаграфіі: Чжан Цзюньчжао («Адзін і восем», 1983), Чэнь Кайгэ («Жоўтая зямля», 1984), Чжан Імоў («Кроў у Чорнай даліне», 1984), Цянь Чжуанчжуана («Закон палявання», 1984). Пратэст супраць палітызаванага, схематычнага кіно. Вяртанне на экран вобраза звычайнага чалавека, пошукі новых сродкаў мастацкай выразнасці. Рост кінавытворчасці. Цяжкасці пераадолення стэрэатыпаў і догм.

Вяршыня «новага кіно» – творчасць Чэнь Кайгэ (Chen Kai-Ko, р. 1952), Чжан Імоў (Zhang Yimou, р. 1950), Цзян Вэнь (р. 1963). Сусветны поспех фільма Чэня Кайгэ «Уладар развітваецца з наложніцай» (1994). Імкненне да вызвалення кітайскага кіно ад шаблонаў эстэтычных пабудоў, вывад індывіда з-пад улады догмаў у ранніх фільмах Чжана Імоў «Чырвоны гаалян» (1987), «Высока вісіць чырвоны ліхтар» (1991). Герой-пераможца, разбуральнік сацыяльных механізмаў у фільмах Чжана Імоў 1990–2000-х гг.: «Герой» (2002), «Дом лятаючых клінкоў» (2004). Выразнасць дэталі, экспрэсіўнасць мантажу ў фільмах Цзян Вэня («Дні яркага сонца», 1994; «Д'яблы на парозе», 2000).

### *Тэма 22. Экранная культура Ганконга*

Джэкі Чан (Jackie Chan, р. 1954) і Джон Ву (John Woo, р. 1946): сусветны трыумф ганконгскага «брэнда». З'яўленне камедый кун-фу з удзелам Джэкі Чана – «рыцара кун-фу камічнага вобраза». Рызыковыя трукі, выкарыстанне спецэфектаў, экзатычная натура ў фільмах Дж. Чана («Удар маланкі», 1995; «Хто я?», 1998 і інш.). Гангстарскі фільм-дзеянне ў творчасці Джона Ву. Праблема выбару паміж агульначалавечымі каштоўнасцямі і кодэксам гонару ў лепшых фільмах рэжысёра: «Забойца» (1989), «Куля ў галаве» (1990).

Дыфузія стыляў і жанраў у творчасці Вонга Кар Вая (Wong Kar Wai, р.1958) і Цуй Хака (Tsui Hark, р. 1950). Постмадэрнісцкія фільмы Вонга Кар Вая «Дзікія дні» (1991), «Попел часу» (1994), «Чунцын-экспрэс» (1995). Сумяшчэнне традыцыйнай кітайскай тэматыкі (міфалагічныя персанажы і сюжэты, кун-фу) і стылістыкі постмадэрнізму ў фільмах Цуй Хака «Матылькі-забойцы» (1979), «Цзу: воіны з Чароўнай Гары»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(1983), «Блюз пекінскай оперы» (1986), «Аднойчы ў Кітаі» (1990).

Дэстабілізацыя ганконгскага кіно ў 1990-я гг. Эміграцыя рэжысёраў Джона Ву, Цуй Хака, Рынга Лэма, Клары Ло.

Далейшае развіццё «азіяцкага Галівуда» пасля далучэння да КНР (ліпень 1997 г.). Поспех фільмаў Вонга Кар Вая, Джэкі Чана, Стэнлі Квана.

## Раздзел V. Тэорыя тэлебачання

### *Тэма 23. Тэлебачанне ў сістэме экраннай культуры*

Сінтэтычная прырода тэлебачання. Узаемасувязь тэлемастацтва з традыцыйнымі мастацтвамі (фальклорам, літаратурай, тэатрам, музыкай, выяўленчым мастацтвам). Тэлемастацтва ў сям'і тэхнагенных мастацтваў (фотамастацтва, кінамастацтва, радыёмастацтва, дыгітальнае мастацтва).

Якасці тэлебачання: аўдыявізуальнасць, сімультаннасць, інтэрактыўнасць, мультымедыйнасць. Прасторава-часавы кантынуум тэлебачання. «Прамы эфір» як феномен тэлебачання.

Тэлебачанне як цэласная мастацкая сістэма. Жанры тэлемастацтва: тэлекіно, тэлетэатр, тэлеперадача. Тэлевізійны фільм. Касетнае ТБ. Мультымедыйнае мастацтва.

Журналісцкія прафесіі на тэлебачанні: рэдактар, рэпарцёр, аглядальнік, карэспандэнт, вядучы навінных праграм, інтэрв'юер, шоўмен.

### *Тэма 24. Жанравая сістэма тэлебачання*

Класіфікацыя мастацкіх форм тэлевізійных твораў. Ігравыя і неігравыя жанры. Тэлебачанне як мастацкая сістэма. Рэпрадуктыўны і прадуктыўны ўзроўні тэлебачання. Тэлевізійныя медыйныя артэфакты (серыі фільмаў) і пазамастацкія формы (навіны, спорт і інш.).

Жанры тэлевізійнай журналістыкі. Жанры інфармацыйнай (відэасюжэт, справаздача, выступленне, інтэрв'ю, рэпартаж), аналітычнай (каментарый, агляд, бяседа, дыскусія, ток-шоу, прэс-канферэнцыя, карэспандэнцыя /«перадача»/), мастацкай (нарыс, замалёўка, эсэ, фельетон, памфлет) публіцыстыкі. Сатырычныя жанры.

### *Тэма 25. Тэлевізійная праграма*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паняцце «фармат тэлевізійнай праграмы». Праграмы – іх стылявыя асаблівасці. Паняцце індывідуальнага стылю тэлежурналіста. Роля тэлежурналіста ў інфармацыйных праграмах і ў інфармацыйна-аналітычных штотыднёвіках. Роля журналіста ў аўтарскай (персанальнай) публіцыстычнай ці культурна-асветніцкай праграме. Асаблівасці інфармацыйных праграм розных краін і тэлекампаній. Жывапісна-выразныя сродкі, асаблівасці мантажу інфармацыйных і публіцыстычных праграм розных краін і тэлекампаній.

*Тэма 26. Тэлефільм*

Уплыў жанравых якасцей тэлепраграмы на тэлефільм (працягласць тэлепраграмы ў часе, спалучэнне ў ёй зафіксаваных «тэкстаў» і прамая трансляцыя, цэласнасць прасторава-часавага кантынууму).

Тэлефільм як элемент тэлепраграмы. Уплыў якасцей тэлепраграмы на эстэтыку тэлефільма.

Мастацкі тэлефільм. Уплыў на яго якасці кінафільма і новых якасцей, якія абумоўлены яго ўключанасцю ў тэлепраграму. Яго віды і жанры.

Дакументальны тэлефільм. Яго сувязі з кінадакументалістыкай, электроннай журналістыкай і дакументальнымі жанрамі тэлебачання. Яго віды і жанры.

Музычны тэлефільм. Уплыў на яго музычнай і экраннай культуры і музычнага тэатра. Спецыфіка музычнага тэлефільма. Яго віды і жанры.

## Раздзел VI. Тэлебачанне ў грамадска-палітычным і сацыякультурным кантэксце

*Тэма 27. Тэхнічныя перадумовы з’яўлення тэлебачання*

Патрэбнасць у інфармацыі як стымул узнікнення і развіцця сродкаў інфармавання. Вынаходніцтва тэлебачання: работы П. Бахмецьева, А. Папова, Б. Розінга, П. Ніпкава, Б. Грабоўскага, Л. Цярмена, А. Адамяна, П. Шумакова, В. Зварыкіна. «Механічнае» тэлебачанне і электроннае ТБ. Змест эксперыментальных тэлепраграм у 1930-я гг.

*Тэма 28. Эксперыментальнае вяшчанне 1930–1940-х гг.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Эксперыментальнае вяшчанне 1930–1940-х гг. Гісторыя ўзнікнення і развіцця дзяржаўнага (на прыкладзе Германіі 1930–1940-х гг., Францыі 1950–1960-х гг.), грамадскага тэлебачання (Вялікабрытанія – BBC), камерцыйнага тэлебачання (ЗША).

*Тэма 29. Фарміраванне тэлебачання як сродку масавай інфармацыі (1950–1960-я гг.)*

Фарміраванне тэлебачання як сродку масавай інфармацыі (1950–1960-я гг.). 1957 год (і VI Сусветны фестываль моладзі) – пераломны ў станаўленні дзяржаўнай сістэмы тэлевізійнага вяшчання ў СССР: ад «выспеннага» да агульнасаюзнага вяшчання. Пошук новых форм экраннай журналістыкі (перавага «прамога» тэлебачання).

Сацыяльна-гістарычныя передумовы імклівага развіцця савецкай тэлепубліцыстыкі ў 1960-я гг. (хрушчоўская адліга, дэсталінізацыя, неабходнасць у дыскусійных зносінах, стварэнне сістэмы тэлестудый і тэлецэнтраў у СССР). Крызіс публіцыстыкі пасля 1968 г. (Пражская вясна і яе наступствы).

*Тэма 30. Савецкае тэлебачанне 1970-х – 1985 гг.*

Асаблівасці развіцця савецкага ТБ у 1970-я гг. (павышэнне дзяржаўнага і сацыяльнага статусу, узмацненне ідэалагічнага кантролю). Рэарганізацыя тэлебачання ў 1970-я гг. Дзяржтэлерадыё СССР і яго роля ў расшырэнні грамадска-палітычнага раздзела вяшчання (1969–1985 гг.) Цэнтралізацыя праграмнай палітыкі; выцясненне «прамога» тэлебачання відэамагнітнай запіссю; удасканаленне сістэмы падрыхтоўкі і павышэння прафесійнага ўзроўню супрацоўнікаў тэлебачання.

*Тэма 31. Тэлебачанне перабудовы і галоснасці (1985–1991 гг.)*

Тэлебачанне як інструмент перабудовы і галоснасці: «12 паверх», «Позірк», «Да і пасля поўначы», трансляцыя I з’езда народных дэпутатаў – іх роля ў разбурэнні пастулатаў палітычнай сістэмы. Камерцыялізацыя ТБ Расіі пасля 1991 г. Прадзюсарскія і вяшчальныя тэлекампаніі ў Расіі, Беларусі і ў свеце. Прынцыпы іх узаемадзеяння.

*Тэма 32. Сучасныя праблемы тэлебачання*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасны стан тэлевізійнай журналістыкі ў Расіі, Беларусі і ў свеце, перспектывы развіцця тэлебачання. Дзяржаўнае тэлебачанне ў сучаснай Расіі і Беларусі. Развіццё рэгіянальнага тэлебачання ў Расіі і Беларусі. ТЭФІ («Тэлевізійны эфір») і іншыя конкурсы тэлепраграм у Расіі. Конкурс «Тэлеваршыня» ў Беларусі. Міжнародныя сувязі расійскіх і беларускіх тэлекампаній. ІНПУТ – тэлевізійныя сувязі прафесіяналаў па лініі ЮНЕСКА.

Сацыяльныя функцыі розных тэлеканалаў, уплыў камерцыйных, партыйных і дзяржаўных інтарэсаў на функцыянаванне ТБ у розных краінах. Грамадскае тэлебачанне ў ідэале і на практыцы. Сацыяльны кантроль за дзейнасцю ТБ. Тэлекрытыка як форма сацыяльнага кантролю. Тэлебачанне ў перадвыбарных кампаніях. Этычныя абмежаванні ў дзейнасці тэлежурналіста. Правы журналіста на ацэначныя меркаванні. Тэорыя сацыяльнай адказнасці і сучаснае ТБ. «Новы журналізм» і тэлебачанне. Прычыны заняпаду і перспектывы «інверсцігейтарскай» (расследуючай) журналістыкі. Метады працы журналіста ў «прэцызійнай» (дакладнай) журналістыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел VII. Тэлебачанне і грамадства

### *Тэма 33. Тэлебачанне як працэс камунікацыі*

Цэласная мадэль: камунікатар – паведамленне – канал – аўдыторыя. СМІ і сацыяльнае кіраванне. Рэйтынг перадач, праграм, каналаў. Значэнне рэйтынгу ва ўмовах міжканальнай канкурэнцыі. Эканоміка і праграмная палітыка. Маналагічная і дыялагічная камунікацыя; палітычная залежнасць і тэхніка-тэхналагічныя магчымасці; інтэрактыўнае тэлебачанне.

### *Тэма 34. Грамадскія функцыі тэлебачання*

Грамадскія функцыі тэлебачання (інфармацыйная, культурна-асветніцкая, сацыяльна-педагагічная, арганізацыйная, адукацыйная, рэкрэацыйная, інтэгратыўная).

### *Тэма 35. Тэлебачанне за мяжой*

Гісторыя ўзнікнення і развіцця дзяржаўнага (на прыкладзе Германіі 1930–1940-х гг., Францыі 1950–1960-х гг. – ОРТФ), грамадскага (Вялікабрытанія – Бі-бі-сі, Германія – АРД),

камерцыйнага (ЗША) тэлебачання. Рускі ўдзел (Зварыкін, Сарноў) у стварэнні тэлебачання ў Паўночнай Амерыцы.

Характарыстыка сучаснага стану (канец XX ст.) тэлебачання на пяці кантынентах. Глабалізацыя і спецыялізацыя; фарміраванне змешаных мадэлей (суіснаванне дзяржаўнага, грамадскага і камерцыйнага ТБ у адной праграмнай прасторы). Асаблівасці ўдзелу ТБ у палітычным і сацыякультурным жыцці вядучых замежных краін.

*Тэма 36. Перспектыўныя кірункі развіцця тэлебачання*

Кабельнае ТБ. Вяшчанне праз штучныя спадарожнікі Зямлі. Хатняе відэа і камп’ютарабачанне. Камерцыялізацыя тэлебачання – агульнасусветная тэндэнцыя. Рэклама як творчасць. Мастацтва ў электронных сетках (Інтэрнэт). Прадказальныя перспектывы развіцця ТБ у XXI ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Агафонова, Н. А.* Искусство кино: этапы, стили, мастера: пособие для студентов вузов / Н. А. Агафонова. – Минск : Тесей, 2005. – 192 с.

2. *Агафонова, Н. А.* Экранное искусство: художественная и коммуникативная специфика / Н. А. Агафонова. – Минск : БГУКИ, 2009. – 273 с.

3. *Егоров, В. В.* Телевидение: страницы истории / В. В. Егоров. – М. : Аспект-пресс, 2004. – 202 с.

4. Новые аудиовизуальные технологии: учеб. пособие / отв. ред. К. Э. Разлогов. – М. : Едиториал УРСС, 2005. – 488 с. – (Academia XXI).

5. Режиссерская энциклопедия. Кино Европы / отв. ред. Г. Н. Компаниченко ; сост. М. М. Черненко. – М. : Материк, 2002. – 204 с.

6. Телевизионная журналистика: учебник / редкол. : Г. В. Кузнецов, В. Л. Цвик, А. Я. Юровский. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Изд-во МГУ, 2002. – 239 с.

*Дадатковая*

1. *Болгарин, И. А.* Феномен многосерийного телефильма / И. А. Болгарин. – М. : Бюро пропаганды сов. киноискусства, 1978. – 53 с.

2. *Бейли, К.* Кино: фильмы, ставшие событиями: пер. с фр. / К. Бейли. – СПб. : Акад. проект, 1998. – 395 с. – (Компакт-энциклопедия).

3. *Вакурова, Н. В.* Типология жанров современной экранной продукции : учеб. пособие / Н. В. Вакурова, Л. И. Московкин. – М. : Ин-т соврем. иск., мастерская телевизионной журналистики, 1997. – 66 с.

4. *Вачнадзе, Г. Н.* Всемирное телевидение: Новые средства массовой информации – их аудитория, техника, бизнес, политика / Г. Н. Вачнадзе. – Тбилиси : Ганатлеба, 1989. – 627 с.

5. Гісторыя кінамастацтва Беларусі: у 4 т. / В. Ф. Нячай, В. А. Мядзведзева, Н. А. Агафонава ; навук. рэд. В. Ф. Нячай. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – Т. 3. Тэлевізійнае кіно: 1956–2002 гг. – 374 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*6.* История зарубежного кино. 1945–2000: учебник для вузов / сост. и отв. ред. В. А. Утилов. – М. : Прогресс-Традиция, 2005. – 560 с.

*7. Копылова, Р. Д.* Открытый экран: Телевизионное зрелище и диалог / Р. Д. Копылова. – СПб. : РИИИ, 1992. – 181 с.

*8. Лотман, Ю. М.* Диалог с экраном / Ю. М. Лотман, Ю. Г. Цивьян. – Таллинн : Александра, 1994. – 216 с.

*9. Марченко, Г.* Телевизионный театр. Возможности. Специфика / Г. Марченко. – М. : Искусство, 1978. – 154 с.

*10. Муратов, С. А.* Телевизионное общение в кадре и за кадром: учеб. пособие / С. А. Муратов. – М. : Аспект-Пресс, 2003. – 201 с.

*11. Нечай, О. Ф.* Телевидение как художественная система / О. Ф. Нечай; ред. Р. Н. Ильин. – Минск : Наука и техника, 1981. – 256 с.

*12. Плавник, А. А.* История белорусского телевидения : учеб.-метод. пособие по курсу «История радио и телевидения Беларуси» : в 2 ч. / А. А. Плавник, Л. Ф. Шилова, Н. Т. Фрольцова. – Минск : М-во нар. образ. БССР, 1989. – 2 ч.

*13. Рокотов, В.* Голливуд : от «Унесенных ветром» до «Титаника» / В. Рокотов. – М. : ЭКСМО-Пресс, 2001. – 416 с.

*14. Сокольская, А. Л.* Поэтика ТВ: пути и поиски / А. Л. Сокольская. – М. : Искусство, 1980. – 127 с.

*15.* Средства массовой коммуникации в художественной культуре XX века: в 4 т. – М., 2001–2003. – 4 т.

*16. Теплиц, Е.* История киноискусства / Е. Теплиц; пер. [сокр.] с пол., предисл. Н. П. Абрамова. – М. : Прогресс, 1968–1974. – 1895–1927. – 1968. – 336 с.; 1928–1933. – 1971. – 278 с.; 1934–1939. – 1973. – 271 с.; 1939–1945. – 1974. – 314 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рекамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для кантролю якасці адукацыі выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

– тыпавыя заданні;

– тэсты па асобных раздзелах і дысцыпліне ў цэлым;

– вуснае апытанне падчас заняткаў;

– складанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;

– выступленне студэнтаў на семінарах па распрацаваных імі тэмах;

– выступленне студэнтаў на навукова-практычных, навукова-творчых канферэнцыях з падрыхтаванымі імі дакладамі;

– абарона курсавых работ;

– пісьмовы экзамен, вусны экзамен;

– дзяржаўны экзамен;

– абарона дыпломных работ.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў уключае напісанне рэфератаў па вывучаемых тэмах, а таксама падрыхтоўку да віктарыны па кінематаграфічным матэрыяле (прагляд аўдыявізуальнага матэрыялу).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**МАСТАЦТВА XX ст.**
**Раздзел 2. ЭКРАННАЯ КУЛЬТУРА**

*Вучэбная праграма для ўстаноў вышэйшай адукацыі для спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,86. Ул.-выд. арк. 1,34. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ